**Назва музея:** Музей “Слава настаўніку. Зала памяці У.С.Караткевіча”

**Назва ўстановы адукацыі:** Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №3 г.Оршы імя У.С.Караткевіча”

**Адрас музея**: Віцебская вобласць, г.Орша, вул. 1 Мая, д.41

**Профіль музея:** гістарычны (агульнагістарычны)

**Сайт музея** (указаць спасылку): няма

**Старонка музея на сайце ўстановы адукацыі:**

https://sh3.goroo-orsha.by/воспитательная-работа/идеологическая-работа/музей

**Старонка ў сацыяльных сетках (указаць спасылку)**: няма

**Дата прысваення музею статусу “народны”**: няма

**Інфармацыя аб музеі:**

Музей “Слава настаўніку. Зала памяці У.С.Караткевіча” пачаў сваю дзейнасць 5 кастрычніка 1986 года. Стваральнік, першы кіраўнік і заснавальнік музея – Л.Д. Радомская. Музей складаецца з 2-х залаў (“Слава настаўніку” і “Зала памяці У.С.Караткевіча”). Музей з’яўляецца адной з форм работы па развіцці творчай, інтэлектуальнай, камунікатыўнай дзейнасці і грамадскай актыўнасці вучняў у працэсе збірання, даследавання, апрацоўкі і прапаганды матэрыялаў крыніц па літаратурна-краязнаўчаму, гісторыка-культурнаму напрамкам Аршанскага рэгіёна, якія маюць выхаваўчую і навукова-пазнавальную каштоўнасць. Перспектыўнымі інавацыямі ў музеі з'яўляюцца інтэрактыўныя экскурсіі, інтэрактыўныя формы работы з экспанатамі. З мэтай захавання гістарычнай памяці аб сваіх земляках распрацаваны і рэлізуецца праект “У.С.Караткевіч…Насустрач дзецям”. Асаблівасць праекта абумоўлена дзейнасцю модульных груп з ліку вучняў аб’яднання па інтарэсах “Юныя экскурсаводы”, а таксама стварэннем мабільнага музея, які спрыяе папулярызацыі ведаў аб знакамітым земляку. У музеі праводзяцца наступныя тэматычныя экскурсіі: “Вандроўкі У. Караткевіча”, “Першыя навучальныя ўстановы Оршы”, “Зямля пад белымі крыламі”, “Пісьмовыя прыборы вучняў”, “Выпускнікамі школы”. Кіраўнік музея – Пруднікава Наталля Пятроўна.

**Кароткая характарыстыка музейных фондаў**: асноўны фонд—113, які ўключае: рукапісы, паштоўкі, кнігі з аўтографамі, асабістыя рэчы Уладзіміра Караткевіча і інш. прадметы. Дапаможны фонд – 605, які ўключае копіі дакументаў, рукапісаў, фотаздымкі, рэпрадукцыі, газеты.

**Найбольш каштоўныя музейныя прадметы**: гадзіннік “Ракета” У.С. Караткевіча (1970/1984гг.); Партфель У.С.Караткевіча (сярэдзіна ХХ ст./ 1987г.). Экспанаты былі перададзены ў музей сястрой У.С.Караткевіча Наталляй Сямёнаўнай Кучкоўскай.

**Апісанне экспазіцый:**

**Зала памяці У. С. Караткевіча.**

1. “Дзіцячыя гады У.С.Караткевіча”. Экспазіцыя распавядае пра дзіцячыя гады У.С.Караткевіча. Тут змешчаны цікавыя і рэдкія фотаздымкі з сямейнага альбома Караткевічаў, лісты і малюнкі маленькага Валодзі.

2. “Студэнцкія гады У.С.Караткевіча”. У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі студэнцкіх гадоў У.С.Караткевіча, копіі дакументаў, характарыстыка пасля заканчэння Кіеўскага ўніверсітэта, фота Караткевіча з

настаўнікамі СШ №8. Частка экспазіцыі прысвечана літаратурнай дзейнасці У.С.Караткевіча. Падарожжы У.С. Караткевіча. Матэрыялы стэнда “Зямля пад белымі крыламі” прысвечаны падарожжам Караткевіча па Палессі. Тут змешчана шмат фотаздымкаў, зробленых фотакарэспандэнтам Валянцінам Ждановічам, сябрам Караткевіча, з якім разам вандравалі па Беларусі.

**Зала “Слава настаўніку”.**

1. “Гісторыя адукацыі на Аршаншчыне ў XVI-XIX стагоддзях”. У экспазіцыі пададзена інфармацыя аб першых навучальных установах, якія былі адкрыты ў горадзе Орша яшчэ ў 16 стагоддзі, першых настаўніках, якія пакінулі пасля сябе след у гісторыі горада і краіны. У цэнтры экспазіцыі-дыярама па карціне М. Багданава-Бельскага “Каля дзвярэй школы”.

2. “Станаўленне савецкай школы ў 1917-1941 гадах” . У экспазіцыі на стэндзе прадстаўлены фотаздымкі, дакументы, у якіх распавядаецца аб стварэнні школ у горадзе Орша, а таксама школ для дарослых (па ліквідацыі непісьменнасці). У экспазіцыі можна ўбачыць пісьмовыя прыборы вучняў: чарніліцы, пёравыя ручкі, наглядныя дапаможнікі.

3. “На абароне Радзімы”. З драматычнымі падзеямі Вялікай Айчыннай знаёмяць раздзелы экспазіцыі: “Настаўнікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны” і “Саша Котаў – герой Вялікай Айчыннай вайны, вучань школы”. У экспазіцыі знаходзяцца прадметы з канцлагера (лыжка і рэшткі адзення).

4. “Настаўнікі-наватары”. У экспазіцыі маюцца: фотаздымкі педагогаў-наватараў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё сучаснай адукацыі; фотаздымкі вядучых педагогаў Аршаншчыны, інфармацыя пра іх жыццё і педагагічную дзейнасць, асабістыя рэчы настаўнікаў, рукапісныя работы, кнігі.

5. “Летапіс сярэдняй школы №3 г.Оршы” . У экспазіцыі ідзе распавед пра гісторыю школы, яе станаўленне і развіццё, прадстаўлены фотаздымкі з былымі педагогамі і выпускнікамі школы.

**Узнагароды:**

Рэспубліканскі конкурс прафесійнага музейнага майстэрства, намінацыя “Навацыі ў музейнай дзейнасці”, 2023 год, Дыплом II ступені (кіраўнік музея Н.П.Пруднікава).

Фотаздыкі музея:

https://docviewer.yandex.ru/view/0/?*=QpthQ%2Fy60wanUDCStgUF%2FeWCJWp7InVybCI6InlhLWRpc2stcHVibGljOi8vQ2Y3MVU0V3BmaUlQRGFyNVIwZDZtTjkxQmxzRnR2Mk1abkRFRXl2dk1EWm9MWnVmS25JZDVmNHE5UjRES2FydXEvSjZicG1SeU9Kb25UM1ZvWG5EYWc9PSIsInRpdGxlIjoi0JzRg9C30LXQuS4g0KTQvtGC0L4ucmFyIiwibm9pZnJhbWUiOmZhbHNlLCJ1aWQiOiIwIiwidHMiOjE2OTUwNDU4MzU0MjMsInl1IjoiMjE3NzY2MTgyMTY5NDY4ODQwNCJ9

Дадтковыя матэрыялы:

1. Віртуальная экскурсія па музеі, відэаэкскурсія па мабільным музеі.

https://sh3.goroo-orsha.by/воспитательная-работа/идеологическая-работа/музей/экскурсіі

https://www.youtube.com/watch?v=rtE37yk0CXA&feature=youtu.be

(экскурсия по мобильному музею)